■ Паміж намі

# ТАКІ МАЛЕНЬКІ САКРЭТ

...На тое шэрае мышаня з бледным тварыкам не паставіў бы і закончаны крэцін. Час ад часу забягаючы да мужа на працу, я заўсёды натыкалася на яе ў калідоры і заўсёды яе шкадавала. Цяжка было ўявіць сабе больш нязграбную істоту, якая да таго ж увесь час нешта губляла і блытала. Пры сустрэчы са мной яна ветліва віталася, апускала вочкі і чырванела (а можа, мне гэта толькі здавалася?). Паступова я зусім страціла пільнасць, і вось вам вынік...

Як ён мог? Як ён мог мне здрадзіць? Як ён мог падманваць мяне — такую прыгожую, такую разумную, такую вытанчаную? І з кім? З гэтай невыразнай істотай без грудзей і ног, у вечна шэрых спадніцах і з акулярамі на паўтвара! Пікантнасць сітуацыі заключалася ў тым, што я сама блаславіла мужа на тую замежную паездку (ён не вельмі і хацеў) у кампаніі калег, добра вядомых мне людзей. Яе ж узялі туды ў якасці ці то памочніцы, ці то сакратаркі — карацей, «падай-прынясі»...

Напэўна, «мышка» дапамагала вельмі старанна. Бо, вярнуўшыся з камандзіроўкі, муж адразу з аэрапорта паехаў да яе. («Падрыхтаваць тэрміновую справаздачу... Разумееш, дарагая, офіс у выхадныя на сігналізацыі, ну не ехаць жа да нас дадому!»)

...Я хадзіла з кута ў кут па кватэры, у якой ужо ненавідзела ўсё. Глыбока дыхала і лічыла да дзесяці і назад. Адзін, два... Усё было так добра!.. Тры, чатыры... На новенькае пацягнула мярзотніка... Пяць, шэсць... Усе яны аднолькавыя... Сем, восем... А я так верыла, чакала! Дзесяць, дзевяць... Каза драная, малпа аблезлая... Сем, шэсць, пяць, чатыры, тры...

Кроў пульсавала і біла ў скроні. А можа, зусім не кроў — проста рэўнасць перамяшалася са злосцю, з абурэннем, і сумесь гэтая, прыпраўленая хваравітымі фантазіямі, пагражала ператварыцца ў нешта страшнае. Напрыклад, у сардэчны прыступ. Ці гіпертанічны крыз. Але мне не патрэбен быў крыз. Таму я ўсунула ногі ў туфлі і на першай машыне, якую ўдалося спыніць, паімчала да мужа на працу.

Уляцеўшы ў дзверы офіса, рэзка затармазіла і ціхенька паднялася на патрэбны паверх. О шчасце! У калідоры не было ні душы. Знайшоўшы без цяжкасці патрэбныя дзверы, я націснула на ручку і ўбачыла ў невялікі пакойчык, дзе за сталом, заваленым стосамі нейкіх папер, сядзела ЯНА, утаропіўшыся ў экран камп'ютара сваімі вочкамі-акулярамі... Магчыма, калі б у мяне быў загадзя прадуманы план дзеянняў, я павяла б сябе па-іншаму. Ва ўсялякім выпадку, не адважылася б на ўчынак, які на той момант падаўся абсалютна нармальным. Мала таго, адзіным магчымым з усіх варыянтаў, якія за долі секунды прамільгнулі ў маёй распаленай галаве. Карацей,



я падышла да маленькага століка, на якім стаяла велізарная ваза з кветкамі. Дастала букет. Узяла вазу ў рукі і выліла ўсё яе змесціва на саперніцу. (Кропка. Заслона.) «Мышаня» нават не піскнула...

Нікольні не сумняваючыся ў правільнасці зробленага, я выйшла з кабінета, падумаўшы, што вось жа ёсць Бог на свеце — ён даў мне магчымасць хоць на некаторы час зменшыць пакуты. Аднак вечарам мяне чакаў сюрпрыз — у выглядзе мужа, да глыбіні душы пакрыўджанага маёй «выхадкай». «Гэта проста непрыстойна! — крычаў ён, ляпаючы дзверцамі шафы і збіраючы ў сумку свае рэчы. — Урывацца да незнаёмай жанчыны і так яе зневажаць! Ды калі хочаш ведаць, яна святая! Ва ўсім вінаваты толькі я — не змог з сабой справіцца. А ты... Ты бяздушная, злая істэрычка!»

Шчоўкнуў замок, і ён пабег па прыступках — літаральна пабег, не звяртаючы ўвагі на амаль непад'ёмны баул і радыкуліт, які заўсёды быў прычынай, каб не прыбіраць у пакоі... О, гэта вялікая сіла кахання! Яна здольная прыцягваць тое, што не прыцягваецца, і разрываць тое, што зраслося і пераплялося капілярамі.

* * *

Праз месяц муж патэлефанаваў сам і спытаў, ці можна вярнуцца. «Вядома», — сказала я. «А ты чакаеш?» — спытаў ён пасля невялікай паўзы. «Так», — я паклала трубку, дзівячыся ўласнаму спакою.

Ён вярнуўся, і ўсё пайшло як раней. Я не задавала пытанняў, ён нічога не тлумачыў — быццам проста прыехаў з камандзіроўкі, з далёкай экзатычнай краіны, з якой-небудзь даліны ракі Амазонкі, дзе займаўся бяскрыўдным паляваннем на кракадзілаў... Мы разам спрабавалі склеіць разбітую чашку сямейнага жыцця, і часам гэта амаль удавалася. Асабліва пасля таго, як я даведалася, што «мышаня» звольнілася з работы і знікла ў невядомым кірунку. А яшчэ мы з мужам захапіліся дачай. Дакладней, не дачай, а толькі ідэяй яе пабудаваць. Невялікі ўчастак з хаткай-развалюхай (затое ў добрым месцы, у дзесяці хвілінах хады ад жывапіснага возера) дастаўся мужу ў спадчыну. Але да яго ўсё не даходзілі рукі. І тут мы абое ўчапіліся за гэту ідэю, як за выратавальную саломінку — маўляў, вось тое, што дапаможа нам забыць усе былыя крыўды і пачаць жыццё спачатку...

Я ездзіла па крамах і будаўнічых рынках, прымяраючыся да шпалераў, пакрыццяў і мэблі. Муж дамаўляўся з будаўнікамі і шукаў архітэктара... З апошнімі было напружанне. Тыя, хто падыходзіў па цане, былі занятыя. Тыя, якія былі не занятыя, не падыходзілі па цане. І вось аднойчы... Аднойчы муж патэлефанаваў з работы і ўрачыста паведаміў, што праз гадзіну да нас заедзе адзін чалавек (між іншым, выдатны праектыроўшчык, між іншым, дыпламаваны лаўрэат, намінант і г.д. і да т.п.), які доўгі час стажыраваўся аж у Францыі. У яго ёсць эскізы незвычайнага жылога дома, які ён хоча пабудаваць у якасці эксперымента, гэта значыць за невялікія грошы. Вядома, я павінна госця прыняць, накарміць, напаіць і забавіць рознымі інтэлектуальнымі размовамі — абы ён не збег да таго, пакуль сам муж вернецца з працы...

Я кінулася наразаць салаты і варыць каву. На ўсялякі выпадак памыла галаву і нафарбавала вусны. Скінула пакаёвыя тапачкі і пераабулася ў «шпількі» (хоць у «інструкцыю» мужа апошнія пункты не ўваходзілі).

Госць аказаўся пунктуальным. Разам мы прайшлі на кухню, дзе ўжо чакаў накрыты стол... З ім было нясумна праз дзесяць хвілін і цікава праз сорак. Ён проста гаварыў, і ўсё, што ён казаў, здавалася неверагодна захапляльным. Настолькі, што прыход мужа і, адпаведна, неабходнасць пераключыцца на зусім іншыя праблемы выклікалі лёгкае раздражненне...

Праз тыдзень Раман заехаў зноў — узяць неабходныя дакументы і нешта там у іх удакладніць. На гэты раз мне было няёмка зноў прапанаваць каву. Забраўшы пакет, ён пайшоў да дзвярэй. А я падумала: калі зараз абернецца, значыць... Што гэта павінна было азначаць, я вырашыць не паспела. Ён вярнуўся і пацалаваў мяне. Гэта быў неверагодна доўгі пацалунак. Праз прыадчыненыя дзверы я чула гудзенне ліфта і галасы людзей, нехта спускаўся і падымаўся па лесвіцы, верашчалі дзеці...

Мы дамовіліся сустрэцца назаўтра. У прызначаны час, у прызначаным месцы я села ў яго машыну. Што ён мог мне прапанаваць? Тое, чаго я хацела і чакала — ключы ад кватэры, гаспадар якой знаходзіўся ў ад'ездзе.

...Я і па сённяшні памятаю гэтую дарогу і тое, як мы падымаліся па лесвіцы — павольна і спакойна, як людзі, упэўненыя, што ўжо ніхто і нішто не зможа ім перашкодзіць... Далей была невялікая экскурсія па кватэры, падчас якой мы трымаліся за рукі. Вывучэнне дэталяў і дробязяў — радзімка на падбародку, незагарэлая «палоска» ад заручальнага пярсцёнка, трэшчынкі на вуснах... А яшчэ я памятаю, як у ванным пакоі лілася вада і тонкімі струменьчыкамі сцякала па яго плячах...

* * *

Больш я ніколі не была ў гэтай кватэры. І ўвогуле папрасіла мужа знайсці іншага архітэктара — штонебудзь... э-э-э... больш простае, без прэтэнзій, набліжанае да нашых жыццёвых рэалій. Ён спачатку здзівіўся, а потым пагадзіўся. Дачу пабудавалі за год.

Цяпер мы з мужам жывём душа ў душу: ён дзеліцца са мной сваімі праблемамі, я з ім — сваімі планамі. Па вечарах, утульна ўладкаваўшыся на канапе, мы глядзім любімыя фільмы, часта адначасова вымаўляем адны і тыя ж словы і ніколі не спрачаемся з-за дробязяў. Узаемныя пачуцці стараемся не абмяркоўваць, але калі яго далонь ляжыць на маім плячы, я адчуваю яе цяпло.

Пра мой маленькі сакрэт ён, зразумела, нічога не ведае. Як і не заўважае бляску ў маіх вачах, калі раптам згадвае нашага былога знаёмага, які зноў падаўся ў Францыю, каб праектаваць там свае эксперыментальныя дамы. У такія моманты я стараюся хаваць усмешку, успамінаючы, што, як ні дзіўна, сваім сямейным шчасцем і спакоем абавязана таму чалавеку. А яшчэ я думаю, што сэрца кожнай жанчыны — як акіян, бо яно захоўвае мноства сакрэтаў. І ніводзін мужчына не можа быць упэўнены, што разгадаў хоць бы частку з іх...

**Ала БЫВАЛАВА**

■ Так не бывае

# МУЖЧЫНА І ЖАНЧЫНА — СЯБРЫ?

## ВЫВЕДЗІЦЕ ЯГО НА ЧЫСТУЮ ВАДУ!

**Сяброўства паміж прадстаўнікамі розных полаў магчымае, але вельмі часта мужчына побач з жанчынай толькі прыкідваецца яе сябрам, маючы пры гэтым зусім іншыя намеры. Абмяркуем, як вывесці яго на чыстую ваду. Такім чынам, дзесяць прыкмет падману:**

1. **Падарункі.** «Падманшчык» (мужчына, які пад маскай дружбы ўтойвае пачуцці) дорыць вялікія, дарагія падарункі. Гэтым ён спадзяецца ўразіць ваша сэрца да самых глыбіняў. Сапраўдны сябар дорыць мала і сціпла. Як сябру.

2. **Дапамога.** Калі мужчына на словах гатовы дапамагчы заўсёды і ва ўсім, у любы час дня і ночы — гэта яшчэ ні пра што не сведчыць. А вось калі ён за апошні месяц пяць разоў прыязджаў ратаваць вас на МКАД, прычым тры разы — апоўначы, гэта ўжо не проста так. Мужчына, для якога вы проста сябар, не гатовы траціць на вас столькі часу. У яго, між іншым, і свая жанчына ёсць.

3. **Пакупкі.** Мужчына з задавальненнем ходзіць з вамі па гандлёвым цэнтры, з радасцю заходзіць у кожную краму і згодна ківае, калі вы ўспамінаеце, што вам патрэбна новая сумачка? Лёгка згаджаецца на гэта кожныя выхадныя? Ён проста хоча вам спадабацца. Сапраўдны сябар паводзіць сябе менавіта як сябар. Праводзіць у краме роўна столькі часу, колькі вытрымлівае, і выходзіць падыхаць свежым паветрам. Таму што ў сяброў прынята паважаць інтарэсы адно аднаго і не патрабаваць поўнага адмаўлення ад сябе.

4. **Абмеркаванне мужчын.** Вы можаце абмяркоўваць сваіх мужчын і з «падманшчыкам», і з сапраўдным сябрам. Розніца ў тым, што «падманшчык» будзе заўсёды займаць ваш бок. Ён будзе заўсёды з вамі згаджацца і казаць: «Проста ён цябе не варты». Гэта зручны прыём — няхай усе будуць дрэннымі, адзін ён добры, і рана ці позна вы гэта заўважыце і ацэніце. Сапраўдны сябар будзе ўсяго толькі справядлівы. Калі дрэнна паводзіў сябе ваш мужчына, сапраўдны сябар скажа менавіта так. Калі гэта вы паводзілі сябе, як дурніца, сапраўдны сябар так і скажа. Гэта і ёсць сапраўдная дружба.

5. **Прабачэнні.** Усе памыляюцца: спазняюцца на сустрэчу, забываюць прывезці абяцанае, раняць неасцярожным словам. Розніца ў рэакцыі. «Падманшчык» адразу кідаецца каяцца. Яму страшна, што цяпер ён страціць ваш давер. Таму ён бацца любой сваёй памылкі, нават самай дробнай. Сапраўдны сябар проста стрымана папросіць прабачэння. Калі памылка сур'ёзная, трэба яе выпраўляць. Калі дробная — яна не вартая перажыванняў.

6. **«Падшафэ».** Часам сябры адпачываюць разам. І тады адразу відаць, хто ёсць хто. Калі ён — «падманшчык», то пачне гаварыць вам, якая вы прыгожая і як пашанцуе таму, хто будзе разам з вамі. Потым раскажа пра свой нялёгкі лёс. Потым палезе цалавацца. Сапраўдны сябар будзе расказваць вам пра новую кнігу на сваёй паліцы і перспектывы гібрыдных рухавікоў. Гэта яму больш цікава.

7. **Увага.** Калі вы побач, «падманшчык» усю сваю ўвагу аддае вам. Ад пачатку і да канца вы ў цэнтры. Табе не холадна? Ці прынесці кактэйль? Цудоўна выглядаеш, дарэчы! Сапраўдны сябар памятае, што, акрамя вас, тут ёсць яшчэ ён. Таму вам дастанецца роўна палова яго ўвагі.

8. **Жанчыны.** Сапраўднаму сябру цікавыя іншыя жанчыны ў вашай кампаніі, ён з зацікаўленасцю ставіцца да ідэі «цябе трэба пазнаёміць з Насцяй!» (калі, вядома, ён свабодны). «Падманшчык» адхіляе ўсе прапановы — мякка або жорстка, але заўсёды канчаткова.

9. **Зносіны.** Сапраўдны сябар кантактуе з вамі часцей не сам-насам, а па аддаленых каналах («Скайп», тэлефон, «ВКонтакте»). Усё таму, што ў яго ёсць і іншыя інтарэсы, сярод якіх ён размяркоўвае сваю ўвагу. У «падманшчыка» галоўны інтарэс — вы. Таму ён гатовы праводзіць з вамі як мага больш часу.

10. **Секс.** «Падманшчык» хоча блізкасці з вамі, але баіцца, што вы гэта зразумееце. Таму ўсяляк даказвае, што вы яму цікавая не як жанчына, а як чалавек. Сапраўдны сябар памятае пра тое, што вы жанчына, і ў прынцыпе дапускае секс паміж вамі, але «ў якім-небудзь асаблівым выпадку».



Калі ў паводзінах мужчыны вы можаце выразна вылучыць тры ці больш з пералічаных пунктаў, перад вамі «падманшчык». Далей — вам вырашаць. Насамрэч цікавасць мужчыны да вас як да жанчыны — зусім не мінус мужчыну, і хутчэй гаворыць пра яго добры густ. Ну, а тое, што ён гэты свой інтарэс утойвае... Падумайце, можа, побач з вамі выказваць яго занадта небяспечна?

**Вера ФЕМІНА.**